# КАЛЕКТЫВІЗАЦІЯ Ў БССР НА ПРАЦЯГУ 1927-1939 ГГ.: ШЛЯХІ І ЎРОКІ

*Коронец В.Г. Рудко А.А.*

*Белорусский государственный университет информатики и радиоэлектроники*
*г. Минск, Республика Беларусь*

*Сугако Н.А. – кандидат исторических наук, доцент*

Сярод сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў, праведзеных у мэтах пабудовы сацыялізму, найбольш цяжкім, драматычным і шмат у чым трагічным момантам з’явілася калектывізацыя сельскай гаспадаркі. У гэтым працесе існавала надзвычай шмат складанейшых фактараў аб’ектыўнага і суб’ектыўнага характару.

Згасанне тэмпаў росту сельскагаспадарчай вытворчасці пры адначасовым развіцці тэндэнцый скарачэння яе таварнай часткі адмоўна паўплывала на хлебанарыхтоўчыя кампаніі, асабліва 1927/ 28 і 1928/29 гаспадарчых гадоў. З-за паўпустых дзяржаўных засекаў пасля закупак сялянскай прадукцыі пад пагрозай голаду апынуліся гарады і армія. “Трымальнікі” прадуктаў спажывання адмаўляліся здаваць іх па цвёрдых дзяржаўных штучна нізкіх цэнах, разгортваючы гандаль імі на аснове павышэння росту рыначных цэн незалежна ад дзяржаўнага і кааператыўнага гандлю. Свабодны продаж стаў ва ўрадавых колах разглядацца як наўмысная спекуляцыя “кулакоў” і скупшчыкаў.

У 1928/29 гаспадарчым годзе сітуацыя з хлебазагатоўкамі не толкі паўтарылася, але нават стала больш драматычнай. Прычынамі былі рост цяжару падаткаабкладання “кулацка-заможных гаспадарак”, нарошчванне тэмпаў каллектывізацыі націскнымі метадамі. З мэтай павышэння ўзроўню арганізаванасці збожжанарыхтовак Наркамгандаль БССР у жніўні 1928 г. забараніў калгасам рэалізоўваць жыта па-за сістэмы Белсельсаюза. 5 верасня гэтага ж года Саўнаркам БССР пайшоў яшчэ далей: паводле яго рашэння 90% таварнага хлеба рэспублікі належала нарыхтаваць планавым арганізацыям без выкарыстання паслуг прыватных хлебагандляроў. Пры гэтым былі вызначаны дакладныя тэрміны хлебаздачы і паквартальныя яе аб’ёмы. Больш таго, каб спыніць любыя спробы прыватных гаспадароў адстойваць свае правы, уладатрымальнікамі ў канцы 1928- пачатку 1929 г. былі прыняты захады па датэрміноваму выкананню нарыхтовак на аснове калектыўнай формы здачы хлеба, разгортвання спаборніцтва па датэрміновай хлебаздачы дзяржаве. Гэтыя акцыі са студзеня 1929 г. дапаўняліся массавымі мерапрыемствамі грамадскага ўздзеяння, рэпрэсіямі супраць прыватных нарыхтоўчыкаў, трымальнікаў хлеба і інш.

Масавая калектывізацыя ў канцы 1929 г. – першыя месяцы 1930 г. праходзіла без асноўнага дакумента калгаснага будаўніцтва - прыкладнага статута сельскагаспадарчай арцелі. Першы статут з’явіўся толькі ў пачатку лютага 1930 г., калі масавая і пераважна прымусовая калектывізацыя набрала вялікія тэмпы. У гэтым дакуменце было шмат супярэчнасцей і спатрэбілася яго тэрміновая дапрацоўка. Новы прыкладны статут вышаў у пачатку сакавіка. Гэта першапачатковая палітыка прывяла да шматлікіх негатыўных з’яў – ўтварэння камун як вышэйшай формы аб’яднання, абагульнення фактычна ўсёй жывёлы, уключаючы птушку, да іншых дзеянняў, якія яшчэ больш абвастрылі становішча у вёсцы.

Найбольш трагічным бокам калектывізацыі з’явілася барацьба камуністычнай партыі і савецкай улады з найбольш гаспадарлівай часткай вёскі – так званым кулацтвам. Гэта вылілася ў палітыку “раскулачвання”. Меры, прынятыя супраць заможняга сялянства, былі жосткія.

Сярод пастаноў, прынятых з мэтаю рэалізацыі палітыкі “раскулачвання”, асаблівае месца займае пастанова палітбюро ЦК ВКП(б) “Аб мерапыемствах па ліквідацыі кулацкіх гаспадарак у раёнах суцельнай калектывізацыі”. Яна была прынята 30 студзеня 1930 г. У ёй вызначаліся тры катэгорыі “кулакоў”. Да першай з іх быў аднесенны “контррэвалюцыйны кулацкі актыў”. Ён павінен быў быць тэрмінова ізаліваны шляхам зняволення. Пры гэтым загадвалася магла быць выкарыстана вышэйшая мера рэпрэсій – растрэл ў адносінах да арганізатараў тэрарыстычных актаў, кіраўнікоў контррэвалюцыйных выступленняў і паўстанцкіх арганізацый. Да другой катэгорыі былі аднесены “астатнія элементы кулацкага актыву”. Яны падлягалі высылцы ў аддаленыя мясцовасці СССР, а ў межах аднаго краю – у яго далёкія раёны. Да трэцяй катэгорыі згодна з гэтай пастановай належалі ўсе астатнія заможныя жыхары вёсак. Яны рассяляліся на новых, адведзеных ім за межамі галгасных гаспадарак, землях.

Пастанова вызначала агульную колькасць гаспадарак для ліквідацыі – 3-5%. Разам з тым яна папярэджвала: не распаўсюджаваць раскулачванне на сераднікоў. У лагеры меркавалася накіраваць 60 тыс. сем’яў, у аддалёныя раёны – 150 тыс., у тым ліку па Беларускай ССР адпаведна 4-5 і 5-7 тыс. У пастанове канкрэтызаваліся раёны высылкі. Што датычыць тых сем’яў, якія высылаліся за межы раёна, то пастанова патрабавала мець на ўвазе неабходнасць іх раз’яднання шляхам супрацьстанаўлення моладзі астатнім рэпрысіраваным.

У сувязі з масавай калетывізацыяй і надзвычай складаным яе ходам партыйныя і дзяржаўныя кіраўнікі звярталі асаблівую ўвагу на прыгранічныя раёны. У БССР насцярожанасць улад адносілася ў першую чаргу да польскага насельніцтва. Аб гэтым сведчыць пастанова палітбюро ЦК ВКП(б) ад 5 сакавіка 1930 г. “Аб польскіх сёлах у прыгранічных абласцях”. У ёй прадпісвалася высяліць з прыгранічных акруг Беларусі і Правабярэжнай Украіны сем’і асоб, асуджаных за бандытызм і шпіянаж, актыўную контррэвалюцыйную дзейнасць. Гэта трэба было зрабіць незалежна ад таго адбываецца ў названых раёнах масавая калектывізацыя ці не. Высяляцца павінны былі ў першую чаргу “кулацкія” гаспадаркі ўсіх трох катэгорый, уладальнікамі якіх з’яўляліся прадстаўнікі польскай нацыянальнасці. Дадзеная рэпрысіўная мера ажыццяўлялася дадаткова да той развёрсткі, якая ўжо адбылася. Была вызначана колькасць сем’яў для рэпрэсій: з Беларускай ССР – 10-15 тыс. Гэтыя гаспадаркі высяляліся ў месцы, вызначаныя пастановай ад 30 студзеня 1930 г. адносна кулацкіх гаспадарак першай і другой катэгорый, г. зн. у аддаленыя рэгіёны СССР.

Усё больш важнае значэнне ў калектывізаванай сельскагаспадарчай вытворчасці належыла машына-трактарным станцыям. Яны былі адной з форм дзяржаўнага ўздзеяння на стан спраў у калгасах. Першая ў БССР Койданаўская МТС была створана ў 1929 г. У канцы 1932 г. у рэспубліцы налічвалася 57 МТС. Яны мелі 1569 трактароў. У 1940 г. ва ўсходніх абласцях БССР налічвалася 236 МТС, а трактарны парк павялічваўся ў 9,8 тыс. машын. Узрасла колькасць іншай тэхнікі. Аднак механізацыя селькагаспадарчых работ знаходзілася на пачатковым узроўні. У раслінаводстве толькі ворыва, сяўба, уборка збожжавых былі ў некаторай ступені механізаваны, на жывёлагадоўчых фермах машын амаль не было. Усюды пераважала ручная праца, а конская цяга з’яўлалася асноўнай.

Гэтыя і іншыя мерапрыемствы павінны былі павысіць эфектыўнасць калгаснай гаспадаркі, але на справе гвалтоўны перавод на калектыўную аснову абярнуўся для сельскагаспадарчай вытворчасці застоем у тэмпах развіцця. Асабліва нізкія паказчыкі былі ў пачатку 1930-х гг., калі адбыўся моцны спад у вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі. Нават у перадваенны час ураджайнасць сельскагаспадарчых культур, іх валавыя зборы прадукцыйнасць жывёлы дасягнула ўзроўню дакалгаснай вёскі. У Беларускай ССР ураджайнасць збожжавых культур у калгасах склала ў 1933 г. 6,3 ц з 1 га, у 1940 г. – 7 ц. Ад адной каровы ў 1934 г. было атрымана 810 л малака, а ў 1939 г. – 834 л.

Гаворачы пра негатыўнасць метадаў, трэба адзначыць і станоўчыя моманты. Сярод іх механізацыя сельскагаспадарчых работ. Гэты працэс дазволіў вызваліць дзесяткі тысяч рабочых рук, якія выкарыстоўваліся ў індустрыялізацыі, павысіць прадукцыйнасць працы, павялічыць вытворчасць прадукцыі. Стварэнне буйных высокапрадукцыйных сельгаспадарчых кааператываў, здольных забяспечыць прамысловасць сыравінай, а насельніцтва – прадуктамі харчавання, з’яўляецца важным накірункам развіцця гаспадаркі ва ўсім свеце.

Такім чынам, пераважна прымусовае правядзенне масавай калектывізацыі абярнулася да сялянства цяжкімі выпрабаваннямі, рэпрэсіямі і ўціскам, шырокім выкарыстаннем надзвычайных мер, адлучэннем ад векавых традыцый. Аднак задача, пастаўленая камуністычнай партыяй і савецкай уладай, была выканана – сельскагаспадарчай вытворчасці, як у прамысловасці, будаўніцтве і на транспарце, сталі дамініраваць адміністрацыйна-камандныя метады кіравання з высокай ступенню цэнтралізацыі. Калгасная сістэма аказалася падпарадкавальнай дзяржаўнаму дыктату, фактычна ператварылася ў арганізацыю па выкачванню сельскагаспадарчай прадукцыі на патрэбы прамысловага развіцця, абароны, культуры і менш за ўсё на патрэбы самой вёскі. Кааператыўныя пачаткі ў калгасах былі зведзены да фармальнасцей. Таталітарная рэгламентацыя ўсіх бакоў жыцця вёскі далучыла яе да бальшавіцкай практыкі сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага развіцця. На тэрыторыі Заходняй Беларусі палітыка калектывізацыі ажыцяўлялася пасля ўключэння яе ў склад БССР.

***Спіс выкарыстаных крыніц:***

*1. Адамушка, У. Палітычныя рэпрэсіі 20 – 50-х гадоў на Беларусі / У. Адамушка. – Мінск, 1994. – 158 с.*

*2. Герман, К. К. Ведущая роль рабочего класса в создании колхозного строя в Белоруссии (1926 – 1935 гг.). – Мінск., 1968. – 243 с.*

*3. Да XIII з’езда КП(б)Б. Матэрыялы да справаздачы ЦК КП(б)Б. – Мінск., 1930. – 137 с.*

*4. Из истории репрессий против белорусского крестьянства, 1929-1934 гг. / А. П. Врублевский, Т. С. Протько; Под ред. М. П. Костюка; АН Беларуси, Ин-т истории. - Минск : Навука і тэхніка, 1992. – 142 с.*

*5. Коллективизация сельского хозяйства: важнейшие постановления Коммунистической партии и Советского правительства 1927-1935. – Москва : Изд-во Акад. Наук СССР, 1957. – 575 с.*

*6. Мірановіч, Я. Найноўшая гісторыя Беларусі / Я. Мірановіч. – СПб. : Неўскі прасцяг, 2003. – 243 с.*

*7. Нарысы гісторыі Беларусі. Частка 2 М. П. Касцюк, І. М. Ігнаценка, У. І. Вышынскі і інш. Беларусь, 1995. — 560 с.*

*8. Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии : В. 2 ч. / Под ред. канд. ист. наук Н. М. Мешкова и канд. философ. наук Н. А. Халипова. – Минск : Госиздат БССР, 1961-1967. – Ч. 2: (1921-1966 гг.). / Авт. Н. Н. Акимов, Н. В. Власенко, Ф. А. Зеленовский и др. – 1967. – 586 с.*

*9. Победа колхозного строя в Белорусской ССР. – Минск : Наука и техника, 1981. – 448 с.*